УДК 378.016-057.875:94«1914/45»

Р. В. Міксюк, ст. выкладчык

# ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА
# І ЯЕ АСЭНСАВАННЕ СТУДЭНЦКАЙ МОЛАДДЗЮ

This article deals with scientific and creative works made by BSTU students and dedicated to the Great Patriotic war. The meaning of historic memory in civil and patriotic upbringing of students is analysed here on the material of their works. A variety of themes represented in student's work gives evidence of high morality of students and their fidelity to the Fatherland.

**Уводзіны.** Ідэалагічная і выхаваўчая праца ў вышэйшых навучальных установах на сённяшні дзень з'яўляецца адным з прыярытэтных напрамкаў на шляху ўмацавання беларускай дзяржаўнасці. Найважнейшая мэта выхаваўчай дзейнасці – фарміраванне адданасці дзяржаўнай ідэалогіі, якая грунтуецца найперш на грамадзянска-патрыятычным і ідэйна-маральным выхаванні студэнцкай моладзі.

На аснове ідэй гуманізму, дабра і справядлівасці ў Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце праводзіцца мэтанакіраваная праца па фарміраванні ў навучэнцаў каштоўнасных арыентацый. Студэнтам прапаноўваецца напісаць навуковыя і творчыя працы па пэўна вызначанай тэматыцы, раскрыццё зместу якой патрабуе ад студэнтаў разумення канкрэтнай з'явы, канкрэтных падзей. Моладзь павінна ведаць гісторыю і разумець праблемы сучаснага развіцця краіны і свету, усведамляць небяспеку ксенафобіі, шавінізму, неанацызму, антысемітызму.

**Асноўная частка.** Шмат навуковых і творчых студэнцкіх прац штогод накіроўваецца на міжнародныя, рэспубліканскія, прэзідэнцкія конкурсы, падаецца на выставы.

Спынімся на разглядзе студэнцкіх творчых прац, прысвечаных падзеям Вялікай Айчыннай вайны.

Мінае 65-ы год з Дня Перамогі нашага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, аднак мы зноў і зноў вяртаемся да тых грозных і гераічных падзей 1941–1945 гг. Відавочна, што чым далей у гісторыю адыходзіць той ваенны час, тым больш праблемных пытанняў ўзнікае вакол іх. Моладзь цікавіцца прычынамі ўзнікнення другой сусветнай вайны, якія паўплывалі на адступленне Чырвонай Арміі ў 1941 г., роляй народаў СССР у Вялікай Айчыннай вайне, некаторымі аспектамі партызанскага руху, халакостам, калабарацыянізмам і шматлікімі іншымі пытаннямі. Безумоўна, не апошняй з'яўляецца і праблема вытокаў перамогі, бо далёка не тайнымі сталі звесткі пра негатыўныя з'явы ў эканамічным і палітычным жыцці былога СССР. Часам нават здзіўляе, якой цаной была заваявана перамога.

Вядома, наша моладзь павінна чытаць мастацкую літаратуру, праграмную і непраграмную. Тэма вайны ў літаратуры застаецца заўсёды актуальнай. Пісьменнікі спрабуюць данесці да чытача ўсю праўду, якой бы яна ні была. Са старонак твораў можна даведацца, што вайна – гэта не толькі радасць перамог і горыч паражэння, а яшчэ і суровыя будні, напоўненыя крывёй, болем, насіллем. Многія пісьменнікі самі прайшлі цяжкі салдацкі шлях, але кожны з іх па-свойму спрабуе зразумець, чаму чалавек здзяйсняе подзвіг, дзе яго маральныя вытокі. Аднак студэнты ў сваіх працах у большасці падкрэсліваюць, што дазнаюцца шмат новага пра жахі вайны «без прыўкрас» з запісаў або ўспамінаў сваіх родных – ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны: «Кожны расказ дзядулі пра баі, палон, пабег, шпіталь змянілі мой погляд на вайну. Я ўбачыў яе сапраўдны твар», «Аповед дзядулі пра ваенныя дзеянні партызан так кранулі мяне, што я нават паставіў сябе на яго месца, умоўна выконваў даручэнні, вырашаў жыццёва важныя пытанні».

На думку псіхолагаў, гісторыя, а тым больш ваенная, успрымаецца сёння маладым пакаленнем менавіта праз лёсы людзей, праз пераадоленыя імі выпрабаванні і перажытыя пакуты. І мы маем шанц не толькі па мастацкіх творах і кінастужках расказаць пра вайну і яе ўздзеянне на лёс мільёнаў людзей, на разуменне цаны Перамогі, мірнага жыцця, на асэнсаванне свайго асабістага «я» як грамадзяніна незалежнай Беларусі. Гэту магчымасць моладзі даюць сустрэчы з яшчэ жывымі сведкамі вайны.

Пры разглядзе студэнцкіх прац вызначаецца тое асноўнае, што найбольш уражвае моладзь. Найперш, гэта канцлагеры і халакост. У студэнцкіх працах падкрэсліваецца, што ідэалагічнай асновай злачынстваў фашыстаў стала «расавая тэорыя», якая абвяшчала ўладарства адной нацыі над другой, тэорыя расшырэння «жыццёвай прасторы» для немцаў і права на сусветнае панаванне трэцяга рэйха. Усю тэрыторыю Беларусі фашысты імкнуліся ператварыць ў месца масавага знішчэння людзей. Загадзя распрацаваная гітлераўцамі праграма прадугледжвала стварэнне цэлай сістэмы канцэнтрацыйных лагераў, філіялаў і аддзяленняў. Толькі ў нашай рэспубліцы іх было 260. Самымі вялікімі былі Азарычы і Трасцянец.

У працы «Мы – тысячы ахвяр на трасцянецкім полі» студэнтка даследуе месцы, дзе знішчалі вязняў. У Трасцянцы было іх некалькі: урочышча Благоўшчына – месца масавых растрэлаў;

сам лагер Трасцянец; урочышча Шашкоўка – месца масавага спальвання людзей. Відаць, што яе вельмі ўражваюць успаміны былых вязняў Трасцянца – жывых сведкаў падзей: «Тут, на трасцянецкім полі, дзе ні капні рыдлёўкай, абавязкова наткнешся на чалавечыя косці», «Мне было 15 гадоў. Памятаю, што зімой 1942 года ў Трасцянец пачалі прыбываць эшалоны. Людзей разгружалі асобна, рэчы таксама асобна. Рэчы адвозілі ў хлеў, а людзей у душагубках – у Благоўшчыну», «Яма, у якой спальвалі людзей, знаходзілася тут. Калі ісці з Малога Трасцянца, дык крыху правей ад дарогі да дзіцячага дома выйдзеш да яе. Пры гэтым трэба мінуць агароды, «угноеныя» попелам спаленых вязняў з Мінска, Варшавы, Гамбурга і іншых мясцін, прайсці каля лазні, дзе гестапаўцы не толькі адмывалі сябе ад крыві і смуроду, але і тварылі свае чорныя справы, па-садысцку забіваючы асуджаных імі на пагібель людзей, мінуць поле, паўсюдна ўскапанае пад зямлянкі  і норы, у якіх у той час туліліся ахвяры. Сёння тут яшчэ трапляюцца астаткі рознага ржавага посуду, дарослага і дзіцячага абутку, прадметаў быту замучаных».

З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны беларуская зямля ператварылася ў сапраўдную бойню мірнага насельніцтва і ваеннапалонных. Пацярпелі ўсе народы Беларусі – беларусы, яўрэі, рускія, палякі, татары і інш. Загінуў кожны трэці. Але ў працэнтных адносінах больш за ўсіх пацярпелі беларускія яўрэі. Да канца вайны ахвярамі халакосту сталі 715 тысяч яўрэяў. 500 месцаў знішчэння яўрэяў адзначана на Беларусі.

Да тэмы халакосту звярнуліся дзесяткі студэнтаў універсітэта. У працах «Мінскае гета», «Халакост і Барысаўшчына», «Глыбоцкае гета», «Ілье» і іншых усвядомлены гераічныя і трагічныя старонкі Вялікай Айчыннай вайны, раскрыты трагедыі яўрэйскага народа на тэрыторыі Беларусі, асуджаны фашызм як агідная і бесчалавечная з’ява.

Вось што піша студэнтка ў працы «Ваўкавыскае гета. Жыццё і смерць»: «Я толькі што скончыла працаваць над рэфератам, тэмай якой было вывучэнне арганізацыі, дзейнасці і ліквідацыі Ваўкавыскага гета. Я заўсёды ведала, што Вялікая Айчынная вайна забрала мільёны людзей. Я разумела, што гэта не проста лічбы, гэта лёсы людзей, якія таксама радаваліся і сумавалі, смяяліся і плакалі, стваралі сем’і, нараджалі дзяцей. Тут, у маім родным Ваўкавыску, адбываліся жудасныя падзеі. Тут катавалі і забівалі безабаронных людзей толькі за тое, што яны былі яўрэямі. Іх закопвалі ў зямлю яшчэ жывымі. Па ўспамінах сведкаў, яшчэ некалькі дзён шавялілася тая зямля…. У 1939 г. ў Ваўкавыску пражывала 13 тысяч яўрэяў. Пасля вайны ў жывых засталося каля двух дзесяткаў чалавек».

З прац па Халакосце відаць, што маладое пакаленне мае ўласную думку пра тое, што адбылося ў жыцці яўрэйскага народа. Галоўнае, што яны спрычыніліся да людскога гора. Гэта разуменне патрэбна не толькі для асэнсавання сучасных падзей, не толькі для барацьбы з ідэалогіяй нацызму і неафашызму, экстрэмізму і тэрарызму. Злачынствы супраць чалавецтва нельга апраўдаць ніякім часам даўнасці.

Многія студэнты да тэмы Вялікай Айчыннай вайны звяртаюцца невыпадкова. Амаль у кожнай беларускай сям’і загінулі блізкія людзі, якія застаюцца  прыкладам мужнасці і подзвігу. Памяць пра іх будзе захоўвацца ў сэрцах стагоддзямі.

Вось што піша студэнтка ў працы «Жывы»: «Прайшло шмат часу. Тыя жудасныя дні не вернуцца. Здаецца, даўно пара забыць… Але тыя, хто прайшоў праз агонь вайны, не могуць выкінуць з памяці ўсё тое, што незагойнай ранай таіцца ў душы, помніцца і па-ранейшаму баліць.

Не абышла вайна і маю сям’ю, маіх блізкіх. Бабуля і дзядуля, хоць і былі тады падлеткамі, у падрабязнасцях памятаюць гады вайны: і бамбёжкі, і злых фашыстаў, і матчыны слёзы. Таму я не магу застацца абыякавай да тых падзей, бо менавіта яны адабралі тых родзічаў, якіх я ніколі не бачыла і не ўбачу. Яны ўсе для мяне – героі. Героі, якія змаглі вытрымаць тое, што спаслаў ім лёс. Яны адважна змагаліся з ворагам і ратавалі нашу зямлю. І кожны з іх унёс свой маленькі кавалачак у агульную перамогу. Яны далі нам, маладым, шанс на далейшае жыццё, на будучыню. Я памятаю пра іх і паважаю. Дзякуй вам за перамогу!»

Подзвігу народа прысвечана шмат прац. Яркай сярод іх  з’яўляецца праца «Подзвіг народа – подзвіг кожнага», у якой аўтар раскрывае ўсенародны подзвіг, мацуе гонар як за асобных людзей, так і за ўвесь народ. Адзначым некаторыя радкі з працы:

– Вялікі ўклад у перамогу над ворагам унесла навука. Дзякуючы вучоным, канструктарам наша тэхніка дасягнула высокага развіцця, што мела вялікае значэнне для хуткага ўзняцця эканомікі краіны, удасканалення ўзбраення для Чырвонай Арміі.

– Неабходна ўспомніць слаўных байцоў 17-га Брэсцкага, 87-га Ламжынскага… партызанскіх атрадаў, якія раніцай 22 чэрвеня 1941 года прынялі няроўны бой з вялікімі сіламі ворага.

– З жорсткімі баямі ў мароз і спёку, у дождж і слату «прайшла паўзямлі» ад Волгі да Эльбы наша пяхота.

– Нязгаснай славай пакрыты баявыя знамёны савецкага Ваенна-Марскога Флота.

– Вечная пашана і слава любімцам народа – лётчыкам.

– Бясстрашнымі былі подзвігі танкістаў.

– Паклонімся і выкажам падзяку артылерысту – «Богу вайны».

– Нашы разведчыкі пастаянна і надзейна снабжалі камандаванне даставернай інфармацыяй пра варожыя войскі.

– «Чорнарабочымі» вайны называлі сапёраў.

– Сувязісты злучалі падраздзяленні і часці ў адзіны зладжаны механізм.

– Ваенныя медыкі, медсёстры, санітары сваёй беззаветнай працай, ласкай вярнулі ў строй тысячы байцоў і камандзіраў.

– Ніколі не сатруцца ў народнай памяці слаўныя подзвігі беларускіх партызан і падпольшчыкаў.

Вядома, у тых, хто перажыў вайну, памяць пра яе ніколі не згасне. Важна захаваць яе ў нашчадкаў, важна выхаваць такое пачуццё павагі да тых, хто загінуў у імя іх жыцця. Важна, каб маладога чалавека хвалявала кожны раз, калі ў яго рукі трапіць франтавая фатаграфія, што навекі спыніла імгненне атакі ці кароткага зацішша паміж баямі, або кадры ваеннай кінахронікі, салдацкае пісьмо з перадавой, прызначанае тады толькі блізкім людзям, а сёння абпальвае суровай праўдай часу сэрцы ўсім.

Шмат увагі нададзена тэме мастацтва ў час Вялікай Айчыннай вайны. Уражвае падборка і аналіз плакатаў ваеннай пары, якія натхнялі байцоў і працоўных тылу, выклікаючы нянавісць да заваёўнікаў і ўмацоўваючы веру ў Перамогу. А знішчальная зброя сатыры Кукрыніксаў неадольна біла ворага, усяляючы ў салдат і афіцэраў нашай арміі, усіх савецкіх людзей пачуццё свяшчэннай нянавісці да фашызму, пачуццё ўпэўненасці ў сабе. Ужо на трэці дзень вайны з’явіўся на вуліцах гарадоў краіны плакат Кукрыніксаў «Беспощадно разгромим и уничтожим врага!». Мастакі разумелі, што плакат павінен выйсці своечасова.

Гэтыя плакаты – не толькі гісторыя. Яны і сёння ў нашым духоўным арсенале, бо служаць выхаванню патрыятызму ў новых пакаленняў людзей. Яны расказваюць пра мужнасць і гераізм народа, які самааддана любіць Радзіму, а таксама служыць напамінкам тым, хто выношвае агрэсіўныя планы.

Студэнтаў таксама цікавіць высокі творчы ўздым, які адбыўся ў гады вайны ва ўсіх відах мастацтва. Стварэнне музычных, літаратурных твораў, твораў выяўленчага мастацтва ў гады цяжкіх выпрабаванняў, гастролі тэатральных калектываў у дзеючай арміі, навукова-папулярная і культурна-асветніцкая праца музеяў, бібліятэк з’яўляюцца адной з цікавых старонак культурнага жыцця ў часы вайны. Вартымі ўвагі застаюцца шматлікія лірычныя і маршавыя песні, якія падымалі народ на барацьбу з ворагам. Артыстычныя брагады за гады вайны далі 450 тысяч канцэртаў для франтавікоў. Часам яны выступалі па 3–4 разы ў дзень – і часта пад агнём праціўніка.

Адзначым, што ў некаторых студэнцкіх працах даецца спроба самастойнага аналізу значэння вывучэння тэмы Вялікай Айчыннай вайны, патрыятычнага выхавання: «Сустракаючыся з людзьмі, сведкамі ваеннага ліхалецця, разумееш, якім вялікім выпрабаваннем для чалавецтва была вайна», «Зразумела, што ёсць шмат мастацкіх твораў і кінастужак, прысвечаных ваеннай тэматыцы, якія адлюстроўваюць жудасную карціну тых гадоў, паказваюць гераізм, мужнасць і самаахвярнасць нашых землякоў у імя Перамогі. І для нас, сённяшняга пакалення, вельмі важна ведаць гісторыю нашага народа, бо пераемнасць пакаленняў, напэўна, самае галоўнае ў жыцці любога грамадства».

**Заключэнне.** Пры аналізе студэнцкіх прац, прысвечаных падзеям Вялікай Айчыннай вайны, заўважана, што пры наяўнасці разнастайных стратэгічных пытанняў іх цікавіць асабістая роля ў вайне сваіх родных і блізкіх людзей, сваіх землякоў, а таксама жыццё ў гады вайны таго куточка зямлі, на якім яны нарадзіліся і выгадаваліся. Гэта і ёсць самае важнае ў ідэалагічным і патрыятычным выхаванні, бо любоў да роднай зямлі, да сваёй краіны, да свайго народа пачынаецца з выхавання любові да сваёй малой зямлі, да сваіх родных людзей. Толькі тады моладзь спрычыніцца да гора іншых краін, іншых людзей, адчуе іх боль. Кожны малады чалавек ў нялёгкі час будзе абараняць менавіта сваю малую і, канечне ж, сваю вялікую Радзіму.

Важнай задачай у патрыятычным і інтэрнацыянальным выхаванні моладзі застаецца фарміраванне гістарычнага мыслення і ўсведамлення ролі Беларусі ў захаванні міру і спакою на зямлі, у фарміраванні дэмакратычных і гуманных поглядаў.

Такім чынам, пры вызначэнні зместу лекцыйных ці практычных заняткаў, пры напісанні навуковых даследаванняў па ваеннай тэматыцы выкладчыку трэба памятаць, што кожная тэма, акрамя знаёмства з гістарычнымі падзеямі, фактамі, павінна выхоўваць у моладзі патрыятызм і інтэрнацыяналізм.